Фотарэпартаж: у Стоўбцах упершыню прайшоў турнір па сілавым шматбор'і і пулявой стральбе

06.02.2024 16:35 — Обновлено: 09.02.2024 08:27 Общество



Напярэдадні 35-й гадавіны вываду савецкіх войск з Афганістану ў Стоўбцах упершыню прайшоў турнір па сілавым шматбор'і і пулявой стральбе з пнеўматычнай зброі.

Турнір прысвечаны Дню памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў і юбілейнай даце вываду савецкіх войск з Афганістану. Ладзіўся ён на базе СШ № 3 г. Стоўбцы пад эгідай раённай арганізацыі воінаў-

інтэрнацыяналістаў, пры падтрымцы раённага аддзела ўнутраных спраў, вайсковай часці 25819, райваенкамата і Стаўбцоўскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі.















Спаборнічалі каманды дапрызыўнай моладзі сярэдніх школ № 2 і 3, гімназіі № 1, а таксама Любкаўшчынскай СШ.

Іх змаганне за перамогу пачалося з маршу страявым крокам, разборкі і зборкі аўтамата. У напружанай барацьбе былі вызначаны самыя моцныя і меткія стралкі, будучыя абаронцы Айчыны, а таксама каманды.

У судзейскай калегіі працавалі ў тым ліку і воіны-інтэрнацыяналісты.








ГРАМАТА
ГРАМАТА
ГРАМАТА







Па выніках турніру першае агульнакаманднае месца заваявала СШ № 3 (кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні — Рыгор Мамайка), другое месца — СШ № 2 (кіраўнік — Юрый Лапкоўскі), трэцяе месца — Любкаўшчынская СШ (кіраўнік — Міхаіл Мамайка).








ГРАМАТА


ГРАМАТА


ГРАМАТА


ГРАМАТА





Пераможцам уручаны дыпломы і кубкі, ад спонсара турніру, райадддзела міліцыі, — памятныя падарункі і торты.

«Вы даказалі, што вы — мэтанакіраваныя і моцныя духам, здольныя ісці да новых вышынь», — зазначыў, звяртаючыся да моладзі, арганізатар турніру Рыгор Мамайка.







З членамі спартыўна-патрыятычнага клуба “Абаронца Айчыны” і іншых клубаў, якія прымалі ўдзел у турніры, намеснікам начальніка РАУС Уладзімірам Кудрэвічам сумесна з курсантамі чацвёртага курса УА “Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь” была праведзена прафарыентацыйная работа. У прыватнасці, курсанты расказалі пра ўмовы вучобы, быту, правядзення вольнага часу і паступлення ў ведамасныя ВНУ сістэмы МУС Рэспублікі Беларусь.

Таццяна ПЯТКЕВІЧ, фота аўтара

РЕКОМЕНДУЕМ



Белстат: альтернативные источники данных успешно внедряются в работу статистиков Беларуси



Магнитная буря накроет Землю и продлится двое суток



Названы продукты на завтрак способствующие похудению



В Абу-Даби появится сервис по беспилотным такси



Клубничное мороженое известной российской марки запретили продавать в Беларуси



Специальное комплексное мероприятие «Охота»

ГЛАВНЫЕ НОВОСТИ



Наградили лучших педагогов области

02 октября, 2024 22:23



Профсоюз филиала «Столбцовские электрические сети» совместно с ветеранской организацией филиала организовали для неработающих пенсионеров встречу

02 октября, 2024 18:57



Миссис Золотая Осень: Конкурс для граждан пожилого возраста

02 октября, 2024 18:34

ПОСЛЕДНИЕ НОВОСТИ



1

Белстат: альтернативные источники данных успешно внедряются в работу статистиков Беларуси

03 октября, 2024 14:50



2

Магнитная буря накроет Землю и продлится двое суток

03 октября, 2024 14:20



3

Названы продукты на завтрак способствующие похудению

03 октября, 2024 13:50

© 2024 Все права защищены | Редакция газеты Прамень

Условия использования

3 433
2 096
1 983